III этап XXVIII Рэспубліканскай алімпіяды школьнікаў
па беларускай мове і літаратуры

Комплексная работа па беларускай мове і літаратуры

# ДАВЕДКІ

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Балы | 4 | 5 | 5 | 6 | 5 | 5 | 6 | 9 | 2 | 9 | 56 |

**11 клас**

**Варыянт 1**

**Заданне 1**

| |
|---|
| 1) ***Падарожнік*** – 1) вандроўнік; 2) трыпутнік;<br>***подорожник*** – прыдарожная трава. |
| 2) ***Твар*** – пярэдняя частка галавы чалавека, аблічча;<br>***тварь*** – 1) усякая жывая істота; 2) дрэнны, подлы чалавек. |
| 3) ***Вядомы*** – 1)пра якога ведаюць, славуты; 2) які ідзе пад чыёй-н. камандай;<br>***ведóмый*** – які ідзе пад чыёй-н. камандай. |
| Гэтая з`ява называецца ***м і ж м о ў н а й   а м а н і м і я й .*** |

**Заданне 2**

КАМЕНТАРЫЙ: 1 бал за кожную правільна вызначаную групу. (*Прымаюцца іншыя варыянты аб'яднання пар слоў у групы, калі яны лагічна абгрунтаваны.*)

**Сінонімы**: вязнуць – грузнуць, дзейсны – эфектыўны;
**антонімы**: зблізіць – аддаліць, натуральны – штучны;
**паронімы**: рэгрэс – рэгрэсія.

**Заданне 3**

| Усе словы з малой літары | 1-е слова з вялікай літары | 2-е слова з вялікай літары | Усе словы з вялікай літары |
|---|---|---|---|
| знакі задыяка<br>не давядзі госпадзі<br>паўночная шырата | Афрыканскі кантынент<br>Дзень бібліятэк<br>Сонечная сістэма | зімовая Алімпіяда<br>служыцелі Феміды | День Канстытуцыі<br>Каралеўства Нарвегія |

**Заданне 4**

*Галаву прыхінуць* – прытуліцца, знайсці прыстанішча.

Прыкладныя варыянты адказаў на другую частку задання:

Часта не было дзе галаву прыхінуць у паходзе.
Галаву прыхінуць у сваім доме – памкненне кожнага чалавека.
З-за доўгіх пераходаў не атрымлівалася галаву прыхінуць;
Я папрасіўся ў хату галаву прыхінуць на ноч.
Салдат меў гарачае жаданне галаву прыхінуць для адпачынку.

**Заданне 5**

| Сказ | Граматычная прыналежнасць |
|---|---|
| 1) *Людзі дапамогуць, **толькі** сам рук не апускай.* | Злучнік (умоўны) |
| 2) *На двары яшчэ **толькі** развіднелася.* | Прыслоўе. |
| 3) *Чаго там **толькі** не было!* | Часціца (узмацняльная). |
| 4) ***Толькі** я лягу і вочы закрыю, бачу я вас прад сабою.* | Злучнік (часавы). |
| 5) *У вагоне было ўсяго **толькі** некалькі чалавек.* | Часціца (вылучальна-абмежавальная). |

**Заданне 6**

1) *`агароджанае месца ў свірне, клеці для захавання збожжа, мукі`* (***засек***) – *`штучнае ўмацаванне для ссечаных дрэў, звернутых верхавінамі ў бок непрыяцеля`* (***засека***);

2) *`большы ў тры разы`* (***патроены***) – *`які складаецца з трох частак, трайны`* (***патройны***);

3) *`набірацца розуму, станавіцца разумнейшым`* (***разумнець***) – *`паступаць па-свойму, пускацца ў абстрактныя непатрэбныя разважанні`* (***разумнічаць***).

4) *`месца, дзе вырошчваюць маладыя расліны для высадкі ў грунт`* (***расаднік***) – *`крыніца з'яўлення, размнажэння, распаўсюджання чаго-небудзь`* (***рассаднік***);

5) *`які з'яўляецца ўзорам, мадэллю для чаго-небудзь; стандартны`* (***тыпавы***) – *`які часта сустракаецца, звычайны`* (***тыповы***).

**Заданне 7**



*вясёлы* *дыхаць* *плакаць* *дзьмуць* *заходні*

Паўнавартаснай агульназразумелай мовай сімвалічнае пісьмо стаць не можа, таму што ў яго аснове знакавая сістэма, якую так жа неабходна запамінаць, як словы ***дыхаць, вясёлы*** і інш.

Сімвалічнае пісьмо складаецца са знакаў, для якіх сувязь паміж сімвалам і азначаемым усталёўваецца па дамоўленасці. Гэтым яно падобнае на іншую сістэму, якая складаецца са знакаў. Напрыклад, дарожныя знакі: для таго, каб атрымаць правы, даводзіцца здаваць іспыты і на веды гэтых знакаў). І яшчэ: калі б гэтая сістэма была ўніверсальная, то можна было б адразу ўсё прачытаць і запісаць і не марнаваць час на рашэнне задачы.

**Заданне 8**

ПРАВІЛЬНЫЯ АДКАЗЫ:
Янка Купала / Іван Луцэвіч / радок з твора
Якуб Колас / "Новая зямля" / паэма
Драма / Іван Луцэвіч / "Раскіданае гняздо"

**Заданне 9**

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ: ***кульмінацыя***.).
АБГРУНТАВАННЕ: Элемент сюжэтна-кампазіцыйнай будовы твора; усе іншыя тэрміны абазначаюць мастацкія сістэмы або жанры

**Заданне 10**

ПРАВІЛЬНЫЯ АДКАЗЫ:
– Смутак, смутку, смутнай, Зззяючы , магутных.
– "Родныя вобразы".
– Якуб Колас – Канстанцін (Міхайлавіч) Міцкевіч.
– 1882.